Афіцыйна мітрапаліта прызначаў Канстанцінопальскі патрыярх. Але фактычна заходнерускіх мітрапалітаў выбіраў Вялікі князь, які разлічваў на лаяльнасць святароў да яго палітыкі. Нелаяльны мітрапаліт аказваўся ў складаным становішчы: Вялікі князь мог нават выгнаць яго, апраўдваючыся, напрыклад, наступным чынам: "не хотячи оскудения видети митрополии Киевской и сладав с нашею братьею, с князями Русскими наших Русских земель того Фотья изгнали"[25]. Цікавая таксама спасылка Вітаўта на неабходнасць параіцца з праваслаўнымі феадаламі Вялікага княства, г.зн. "князьями русскими"[26].

Брэсцкая ўнія 1596 г. аб'яднала праваслаўную і каталіцкую цэрквы. Вось як характэрызуе гэту падзею летапіс: "кагды ж тот зъезд только народу рускому зложон, дознавши его быть и тых владыков отщепенцами, оных за пастыров не мети"[27]. Люблінская і Брэсцкая ўнія садзейнічалі акаталічванню і паланізацыі праваслаўнага насельніцтва Вялікага княства Літоўскага.

[1] Чаквин И.В., Терешкович П.В. // Советская этнография. 1990. №6. С.42.
[2] Лихачев Д.С. Национальное самосознание Древней Руси. М., 1947. С.23.
[3] Повесть временных лет. М.; Л., 1950. Ч.1. С.82. (У далейшым – ПВЛ).
[4] Ластовский В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Коўно, 1926. С.7.
[5] ПВЛ. С.82.
[6] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т.21. С.495.
[7] ПВЛ. С.44..
[8] Константин Богрянородный // Изв. гос. академии истории материальной культуры. Вып.91. М.; Л., 1934. С.47.
[9] ПВЛ. С.47.
[10] Там жа. С.102.
[11] Хрестоматия по древней русской литературе. М., 1955. С.32.
[12] Правда русская: Тексты. М.; Л., 1940. Т.2. С.515.
[13] Ключевский В.О. Соч. в 9 т. М., 1987. Т.1. С.219, 222; Он же. Специальные курсы. М., 1989. Т.7. С.85.
[14] Лихачев Д.С. Национальное самосознание Древней Руси. С.12.
[15] Памяць Святога нашага бацькі Кірылы, епіскапа Тураўскага // Спадчына. №2. С.33.
[16] Православный палестинский сборник. СПб., 1885. Т.3. Вып.3(9). С.128.
[17] Там жа. С.140.
[18] Зайкоўскі Э. Беларусіка. Кн.2. Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. Маладзечна, 1992. С.264–265.
[19] Полоцкие грамоты. М., 1977. Вып.1. С.105.
[20] Там жа. С.93.
[21] Там жа. С.32.
[22] Акты Западной России. СПб., 1846. Т.1. С.50..
[23] Там жа. С.51.
[24] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф.КМФ-18, воп.1, спр.8, арк.28.
[25] Акты Западной России. СПб., 1846. Т.1. С.36–37.
[26] Там жа.
[27] Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. Мн., 1978. С.126.

*Н.А.ГЛУШАКОВА*

## ПРАБЛЕМА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎЛАДКАВАННЯ БЕЛАРУСІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ЭСЭРАЎ (снежань 1918–ліпень 1920 гг.)

Распад Расійскай імперыі пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. прыметна актывізаваў беларускі грамадска-палітычны рух. Нацыянальная ідэя авалодала свядомасцю многіх беларусаў-вайскоўцаў, сялян, рабочых, бежанцаў. Носьбітам гэтай ідэі стала нацыянальная інтэлігенцыя, аб'яднаная ў палітычных партыях і грамадскіх арганізацыях. Беларускі народ апынуўся перад праблемай выбару свайго нацыянальна-дзяржаўнага ідэалу. Пры гэтым пошук форм будучага дзяржаўнага ўладкавання края характарызаваўся супрацьборствам розных палітычных сіл, што змагаліся за ўладу. Кожная плынь грамадска-палітычнага руху па-свойму разумела мэты і шляхі рэалізацыі права беларускага народа на самавызначэнне, сацыяльныя і эканамічныя асновы будучай дзяржавы.

Сваю канцэпцыю нацыянальнага адраджэння Беларусі распрацавала і партыя беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў, што ўзнікла ў красавіку 1918 г. у выніку расколу Беларускай Сацыялістычнай Грамады. У яе аснову была

пакладзена ідэя ўласна-беларускага дзяржаўнага жыцця, з якой белэсэры звязвалі перспектывы палітычнага, эканамічнага і духоўнага росквіту свайго народа. Так, яны рашуча адхілілі ідэю грамадоўцаў аб тэрытарыяльнай аўтаноміі Беларусі ў межах Расійскай дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі і выступілі за прызнанне права на свабоднае самавызначэнне за ўсімі народамі былой Расійскай імперыі, у тым ліку і за беларусамі. "Беларусь – па іх меркаванні – павінна была канстытуіравацца як незалежная народная рэспубліка ў межах этнаграфічнага рассялення беларускага народа. Асноўныя законы і форма ўлады ўстанаўліваюцца Усебеларускім Устаноўчым Соймам, выбраным на аснове агульнага, роўнага, тайнага, прапарцыянальнага выбарчага права"[1].

Абвешчаныя ідэі нацыянальнай свабоды і дзяржаўнай самастойнасці белэсэры паспрабавалі рэалізаваць у рамках Беларускай Народнай Рэспублікі, увайшоўшы ў склад яе кіруючых органаў. Але ва ўмовах нямецкай акупацыі (вясной 1918 г. кайзераўскія акупанты занялі заходнія і цэнтральныя раёны Беларусі) па прычынах аб'ектыўнага і суб'ектыўнага характару БНР як рэальнае дзяржаўнае ўтварэнне не склалася.

Між тым напярэдадні вызвалення края ад нямецкай акупацыі ў беларускім нацыянальна-вызваленчым руху выразна акрэсліліся некалькі пунктаў гледжання на далейшыя шляхі дзяржаўнага будаўніцтва. Поруч з нацыянальна-дэмакратычнай плынню (Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў), ідэалам якой была незалежная Беларусь, многія палітычныя партыі і рухі адстойвалі ідэю аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай рэспублікі (меншавікі, расійскія і яўрэйскія буржуазныя партыі, кіраўнікі Заходняй вобласці). З другога боку, актывізавалі сваю дзейнасць прадстаўнікі класава-рэвалюцыйнай плыні (прыхільнікі Белнацкама і Беларускіх секцый РКП(б)), якія настойліва дамагаліся рэалізацыі беларускім народам права на самавызначэнне на аснове савецкага ладу і ў саюзе з РСФСР. Пад уплывам гэтых арганізацый ідэя стварэння Беларускай Савецкай Рэспублікі набывае ў той час усё большую падтрымку.

21–23 снежня 1918 г. у Маскве адбылася канферэнцыя Беларускіх секцый РКП(б), якая прызнала неабходным стварэнне Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі, выбрала Цэнтральнае бюро Беларускіх секцый РКП(б) на чале з З.Жылуновічам. Канферэнцыя абвясціла ідэю "стварэння Беларускай савецкай рэспублікі як фарпоста расійскай сацыяльнай рэвалюцыі".

У гэты ж час і ва ўрадзе РСФСР усё большае распаўсюджванне атрымоўвае ідэя стварэння ўздоўж заходняй граніцы буферных савецкіх рэспублік, якія адмяжоўвалі б тэрыторыю рэвалюцыйнай Расіі ад непасрэднага межавання з капіталістычнымі краінамі.

Існаваў і яшчэ адзін аргумент на карысць абвяшчэння Беларускай Савецкай дзяржавы. Справа ў тым, што кіраўніцтва БНР пачало дыпламатычную кампанію пратэсту супраць бальшавіцкай акупацыі Беларусі. А паколькі ССРБ не была яшчэ абвешчана і не быў створаны яе ўрад, то гэты пратэст па нормах міжнароднага права быў абгрунтаваны. Зразумела, што такая сітуацыя не задавальняла Расію.

Таму 24 снежня 1918 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб утварэнні Беларускага Савецкага ўрада. Шостая Паўночна-Заходняя канферэнцыя РКП(б), якая адбылася ў Смаленску 30 снежня, абвясціла "самастойную Сацыялістычную Савецкую Беларускую Рэспубліку". У склад новага ўтварэння ўвайшлі пяць беларускіх губерняў: Мінская, Смаленская, Магілёўская, Віцебская і Гродзенская. Такім чынам, функцыі ўстаноўчага сходу і парламента Беларусі ўзяла на сябе партыйная канферэнцыя.

Сфарміраваны Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі на чале з З.Жылуновічам сваім Маніфестам ад 1 студзеня 1919 г. абвясціў Беларусь "вольнай незалежнай Сацыялістычнай Рэспублікай".

Большасць беларускіх нацыянальных партый не прызналі ССРБ, разглядаючы яе як нешта незаконнае, штучнае, прынесенае звонку. Так, ЦК БПС-Р, застаючыся прыхільнікам незалежнасці БНР, заявіў, што ССРБ

не з'яўляецца ў поўным сэнсе дзяржавай і таму заклікаў сваіх палітычных саюзнікаў не падтрымліваць яе. "Будаванне беларускай дзяржавы, – тлумачыў пазіцыю эсэраў Т.Грыб, адзін з правадыроў партыі, – азначае стварэнне такіх фізічных і псіхалагічных абставін, калі беларускі народ сам будзе самастойным гаспадаром у сваім родным краі, будзе жыць паводле сваёй уласнай волі і розуму. Стварэнне гэтых абставін і ёсць стварэнне дзяржаўнасці, фундамент якой знаходзіцца ў свядомасці кожнага паасобнага беларуса, у палітычных, культурна-прасветных, прафесійных, спажывецкіх, навуковых, мастацкіх і іншых арганізацыях... Дзеля гэтага пачынаць будаванне беларускай дзяржаўнасці трэба знізу, з фундаменту, а не з верху, са страхі"[2].

Пры гэтым белэсэры справядліва заўважалі, што рэальная палітыка бальшавіцкіх улад на той час была вельмі далёкай ад сапраўднага прызнання незалежнасці і непадзельнасці Беларусі. Не паспела сусветная грамадскасць азнаёміцца з Савецкай Беларуссю ў яе снежаньскіх межах, як 16 студзеня 1919 ЦК РКП(б) пастанавіў адабраць ад ССРБ тры губерні (Віцебскую, Смаленскую і Магілёўскую) і далучыць іх да РСФСР. А яшчэ праз два тыдні старшыня УЦВК Я.Свярдлоў паведаміў, што ЦК РКП(б) прыняў рашэнне зліць Беларускую і Літоўскую рэспублікі ў адну – Літоўска-Беларускую; тым самым Беларуская Савецкая Рэспубліка па загаду з Масквы падлягала ліквідацыі.

БПС-Р расцаніла такое вырашэнне праблемы беларускай дзяржаўнасці як "непапраўную памылку камуністаў". З гэтага становішча партыя бачыла адзінае магчымае выйсце: скліканне Другога Усебеларускага з'езду свабодна выбраных саветаў сялянскіх і рабочых дэпутатаў, прадстаўнікі якога самі вырашаць лёс Беларусі.

У дадзеным выпадку белэсэры выступілі не столькі супраць ідэі стварэння Беларуска-Літоўскай Рэспублікі, колькі супраць механізма яе рэалізацыі. Па іх меркаванні, павінна было мець месца не механічнае злучэнне, а цесны саюз свядомых народаў, на аснове якога была б створана незалежная федэратыўная савецкая Беларуска-Літоўская Рэспубліка. І беларусы, і літоўцы ў ёй, кожны на сваёй этнічнай тэрыторыі, былі б самастойнымі гаспадарамі. Таму як толькі "поўная незалежнасць у дзяржаўным жыцці можа даць народам сілу аб'яднацца нацыянальна і ўраўнавацца з іншымі народамі як культурна, так і эканамічна"[3].

Антыбальшавіцкая пазіцыя БПС-Р у пытанні нацыянальнай дзяржаўнасці прывяла да таго, што партыя вымушана была перайсці на савецкай тэрыторыі на нелегальнае становішча.

Палітычная сітуацыя на Беларусі заставалася складанай. Вясной–летам 1919 г. цэнтральныя і заходнія раёны Беларусі былі акупіраваны польскімі войскамі. Палітыка гвалту і тэрору, накіраваная супраць беларускага народа, паставіла БПС-Р у апазіцыю да польскага рэжыму. Ў сакавіку 1920 г. белэсэры ствараюць Беларускі паўстанцкі камітэт як штаб антыпольскай барацьбы, пачынаюць фарміраванне ўзброеных партызанскіх атрадаў у тыле польскіх войскаў.

Лідэры БПС-Р імкнуліся ў гэты час аб'яднаць у антыпольскай барацьбе і змаганні за незалежнасць Беларусі ўсе палітычныя сілы. У снежні 1919 г. у Смаленску адбылася сустрэча прадстаўнікоў БПС-Р і КП(б)ЛіБ. Яе вынікам было сумеснае пагадненне аб аб'яднанні сіл у барацьбе супраць польскіх акупантаў.

Але саюз з бальшавікамі не быў доўгім і трывалым. Пайшоўшы на яго, белэсэры не адмовіліся ад сваіх ранейшых патрабаванняў, прынцыпова адстойваючы незалежнасць і непадзельнасць беларускай дзяржавы.

Чарговы з'езд БПС-Р, які нелегальна адбыўся 4 сакавіка ў Мінску, прапанаваў пачаць падрыхтоўку Усебеларускага працоўнага кангрэса прадстаўнікоў рабочых і сялян для вырашэння пытання аб дзяржаўнай уладзе на Беларусі пасля выгнання польскіх акупантаў[4]. Пры гэтым белэсэры зыходзілі з таго, што, па-першае, Беларусь – край аграрны, большасць яго жыхароў складае працоўнае сялянства, таму беларуская дзяржава па свайму характару і

унутранаму зместу павінна быць дзяржавай сялянскай. У сувязі з гэтым аб дыктатуры пралетарыяту ў рэспубліцы не можа быць ніякай гутаркі. Па-другое, Беларусь павінна быць дзяржавай непадзельнай і ні ад каго незалежнай, ніякія так званыя арыентацыі не могуць быць падставай яе дзяржаўнага ўладкавання.

Найлепшай формай арганізацыі ўлады белэсэры лічылі ўладу саветаў, якая не дапускае непрацоўныя элементы ні ў якім выпадку да кіраўніцтва і не дае ім права ні выбіраць, ні быць абранымі. Выбары павінны праводзіцца свабодна, без нажыму з боку якой бы то ні было партыі альбо групы[5].

Спецыяльная дэлегацыя БПС-Р на чале з членам ЦК П.Бадуновай на працягу сакавіка 1920 г. абмяркоўвала ў Маскве з наркамам па справах нацыянальнасцяў І.Сталіным пытанне аб адраджэнні пасля вызвалення ад польскай акупацыі нацыянальнай дзяржаўнасці беларускага народа. Ад імя БПС-Р П.Бадунова адстойвала прынцып суверэннасці беларускай дзяржавы, непадзельнасці яе тэрыторыі, неабходнасці стварэння кааліцыі палітычных сіл для сацыялістычных пераўтварэнняў[6].

ЦК РКП(б) станоўча аднёсся да аб'яднання сіл бальшавікоў і белэсэраў у агульнай барацьбе супраць польскіх інтэрвентаў. Што ж датычыцца пытання аб дзяржаўнасці, то ў сувязі з цяжкім становішчам на Заходнім фронце яно было часова знята з абмеркавання[7].

Вырашыць праблему канстытуіравання беларускай нацыянальна-дзяржаўнай улады беларускія эсэры паспрабавалі і пасля вызвалення Мінска ад белапалякаў. У Маскву была накіравана яшчэ адна дэлегацыя ад БПС-Р у складзе Я.Бялевіча і Н.Козіча. Аднак станоўчых вынікаў гэты візіт не меў[8].

Мясцовае ж бальшавіцкае кіраўніцтва ў дадзены момант заняло ў адносінах да партыі белэсэраў палітыку чакання. "Савецкая ўлада ў адносінах да БПС-Р... – сцвярджалася ў рэзалюцыі Прэзідыума ЦК КП(б)ЛіБ ад 11 мая 1920 г. – не можа адразу заняць відавочна варожую пазіцыю, улічваючы тыя вынікі, якія б гэта выклікала ў колах насельніцтва, што знаходзіцца пад іх уплывам. Таму згаджаючыся на іх легальную дзейнасць, камуністычная партыя павінна весці ідэйную барацьбу шляхам агітацыі і прапаганды"[9].

Пасля вызвалення Мінска ад польскіх акупантаў, 11 ліпеня 1920 г., грамадзянская ўлада на вызваленай тэрыторыі перайшла да Мінскага губернскага рэўкама. У яго склад ўвайшлі прадстаўнікі ЦК КП(б)ЛіБ, Бунда, БКА і БПС-Р. У другой палове ліпеня паміж імі распачаліся перамовы. Была створана спецыяльная камісія, якая павінна была распрацаваць умовы супольнай дзейнасці. У камісію ўвайшлі ад КП(б)ЛіБ – А.Чарвякоў і В.Кнорын; ад БПС-Р – Я.Бялькевіч, П.Берднік і М.Пашковіч; ад БКА – У.Ігнатоўскі і ад Бунда – А.Ванштэйн. Пад час яе працы выявіліся прынцыповыя разыходжанні паміж камуністамі і белэсэрамі, асабліва па пытаннях дэкларавання незалежнасці Беларусі і яе межаў, дзяржаўна-палітычнага ладу рэспублікі і яе адносін да суседзяў, вырашэння зямельнай справы. Сябры БПС-Р настойвалі на дакладным вызначэнні ў акце абвяшчэння незалежнасці Беларусі этнаграфічных межаў беларускай савецкай дзяржавы, перадачы ўлады працоўным саветам, выбраным працоўнымі горада і вёскі на прапарцыянальных пачатках, на як мага хутчэйшым надзяленні сялян зямлёй[10].

ЦК КП(б)ЛіБ адхіліў гэтыя патрабаванні і прадстаўнікі БПС-Р 31 ліпеня 1920 г. адмовіліся падпісаць "Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі". Не ўвайшлі яны таксама і ў склад Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта Беларускай рэспублікі, створанага напярэдадні, 30 ліпеня, хоць, як сведчаць архіўныя крыніцы, месца для іх выдзялялася[11].

У далейшым адносіны БПС-Р да Беларускай савецкай рэспублікі не былі катэгарычна адмоўнымі. Ужо летам 1920 г. у партыі намецілася размежаванне. Частка белэсэраў (А.Цвікевіч, К.Дуж-Душэўскі, Я.Мамонька) па-ранейшаму настойвалі на працягу барацьбы як супраць палякаў, так і супраць "імперыялістычных замахаў расейскіх камуністаў".

Другая частка партыйных лідэраў на чале з Т.Грыбам прытрымлівалася іншага меркавання. Яны прызнавалі неабходнасць падрыхтоўкі ўзброенага паўстання супраць акупантаў у Заходняй Беларусі. Адносна ж ССРБ гэтая плынь вырашыла застацца на пазіцыі "ўсебаковай аб'ектыўнай крытыкі бальшавіцкаму рэжыму" і дамагацца перадачы заканадаўчай улады ў краі Усебеларускаму Працоўнаму Кангрэсу, выбранаму з усёй этнаграфічнай Беларусі.

Партыйная ж група на чале з А.Трафімавым і М.Маркевічам выступіла за больш цеснае супрацоўніцтва з савецкай уладай і камуністамі, лічачы магчымым нават уваходжанне ў рады РКП(б).

Такім чынам, Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў мела ўласныя, даволі абгрунтаваныя погляды на формы і змест беларускай дзяржаўнасці. Увогуле, яна не адмаўлялася ад савецкай формы арганізацыі ўлады. Але яе ідэалам былі саветы як органы дыктатуры ўсяго працоўнага народа, аб'яднанага ў органы самакіравання, а не дыктатура пралетарыята, які да таго ж на той час складаў мізэрную меншасць насельніцтва краю. Пры гэтым нацыянальная дзяржава, ва ўяўленні белэсэраў, павінна была быць непадзельнай і ні ад каго незалежнай. Ніякія так званыя арыентацыі не маглі быць падставай яе дзяржаўнага ўладкавання.

[1] НАРБ. Ф.242, воп.1, спр.22, арк.4.
[2] Там жа. Ф.458, воп.1, спр.50, арк.50–51.
[3] Грамадзянін. 1919. 10 лют. С.2.
[4] НАРБ. Ф.242, воп.1, спр.22, арк.6.
[5] Там жа. Ф.325, воп.1, спр.169, арк.77; Грыб Т. Аб дзяржаўнай уладзе // Грамадзянін. 1919. 21 сак. С.1.
[6] Лебедзева В. Палута Бадунова // Беларуская мінуўшчына. 1994. №4. С.52.
[7] Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Ч.II. Гомель, 1993. С.174 і наст.
[8] Архіў КДБ РБ. Спр.18272-С. Т.1, арк.152.
[9] НАРБ. Ф.60, воп.3, спр.430, арк.93.
[10] Мамонька Я. На ўзломе // Спадчына. 1995. №4. С.127 і наст.
[11] На бездарожжы // Змаганне. 1920. 18 ліст.С.1; НАРБ. Ф.325, воп.1, спр.56, арк.93.

*М.А.БЯСПАЛАЯ*

## ДА ПЫТАННЯ АБ УЗДЗЕЯННІ НОВАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ НА ВЁСКУ

Як вядома, сялянства праяўляла незадаволенасць харчразвёрсткай і савецкая ўлада вымушана была шукаць выйсце з сацыяльнага і эканамічнага крызісу, у якім апынулася краіна вясной 1921 г. Шмат напісана аб прыняцці на X з'ездзе РКП(б) новай эканамічнай палітыкі, аб яе асноўных накірунках і задачах. Паўтараць тое, што вядома яшчэ са школьнай парты, няма сэнсу, аднак хацелася б звярнуць увагу на пазіцыю вёскі ў адносінах нэпа. Тэарэтычна нэп быў задуманы як сродак выхаду з эканамічнага крызісу, а як гэта адбывалася на самой справе – сведчаць шматлікія архіўныя дакументы.

Вядома, што адным з галоўных напрамкаў нэпа стала замена харчразвёрсткі натуральным падаткам, які раскладаўся не на ўсю вёску, а на кожную асобную гаспадарку. За аснову налічэння харчпадатку бралася колькасць ворнай зямлі і едакоў у сям'і, а таксама ўраджайнасць, якая ўстанаўлівалася па ўзроўню 1917 г.

Методыка налічэння тагачаснага падатку дазваляе адзначыць некалькі момантаў. Па-першае, падатак бралі з усіх: з бедных і з багатых; па-другое, падатак быў дыферэнцыраваны; па-трэцяе, памер падатку ў геаметрычнай прагрэсіі залежаў ад эканамічнага ўзроўню гаспадаркі. У выніку атрымоўвалася, што падаткавая палітыка садзейнічала не падняццю бедных гаспадарак да ўзроўню багатых, а, наадварот, збядненню багатых. Тым самым дзяржава выбівала глебу з-пад ног у самой сябе.

За кароткі тэрмін па харчразвёрстцы сабралі 2 млн 614 тыс. пудоў збожжа, тым не менш заданне аказалася не выкананым. Па гэтай прычыне на тэрыторыі Беларусі забараняўся свабодны мясцовы абмен на падставе дэкрэта УЦВК